ПРАВААБАРОНЦЫ ЗА СВАБОДНЫЯ ВЫБАРЫ

**Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2010:**
**папярэдняя справаздача па выніках назірання за**
**ТРЭЦІМ днём датэрміновага галасавання (16 снежня)**

*Мінск, 10.00, 17 снежня* – 600 кароткатэрміновых і 80 доўгатэрміновых назіральнікаў кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» вядуць штодзённае назіранне за ходам датэрміновага галасавання на 300 выбарчых участках па ўсёй тэрыторыі Беларусі – у Мінску, абласных і раённых цэнтрах, іншых гарадскіх і сельскіх населеных пунктах. Справаздачы з выбарчых участкаў штодзённа апрацоўваюцца і з'яўляюцца рэпрэзентатыўнымі (назіраннем ахоплена 4,7% ад 6 346 выбарчых участкаў на тэрыторыі краіны), г. зн. дазваляюць ацаніць агульныя тэндэнцыі датэрміновага галасавання. Адсоткі, прыведзеныя ў дыяграмах ніжэй, датычаць 294 выбарчых участкаў, справаздачы з якіх былі апрацаваныя па стане на 10.00 раніцы 17 снежня.

**Умовы назірання**




**Выяўленыя парушэнні**




**Удзел у датэрміновым галасаванні**

| Колькасць участкаў, дадзеныя з якіх былі апрацаваныя на 10.00 раніцы 17 снежня | Колькасць участкаў, на якіх былі вывешаны пратаколы з дадзенымі датэрміновага галасавання за дзень | Колькасць прагаласаваўшых за 16 снежня | |
|---|---|---|---|
| | | Па падліках назіральнікаў | Па дадзеных УВК |
| **294** | **293** | **23 856** | **24 553** |

| Колькасць участкаў, на якіх былі даступныя дадзеныя аб колькасці выбаршчыкаў | Колькасць выбаршчыкаў на гэтых участках | Колькасць выбаршчыкаў, прагаласаваўшых на гэтых участках 16 снежня | Адсотак прагаласаваўшых за 16 снежня ад агульнай колькасці выбаршчыкаў |
|---|---|---|---|
| **210** | **379 677** | **16 583** | **4,37%** |

*Мэтай кампаніі «Праваабаронцы за свабодныя выбары» з'яўляецца назіранне за выбарамі Прэзідэнта Беларусі ў 2010 годзе, ацэнка выбарчага працэсу з пункту гледжання беларускага выбарчага*

This document was created using Smart PDF Creator
To remove this message purchase the product at www.SmartPDFCreator.com

*заканадаўства і міжнародных стандартаў свабодных і дэмакратычных выбараў, інфармаванне пра высновы назірання беларускай грамадскасці і міжнароднай супольнасці. Кампанія з'яўляецца незалежнай і палітычна незаангажаванай. Інфармацыю пра кампанію можна знайсці на сайтах праваабарончага цэнтра «Вясна» (http://spring96.org) і Беларускага Хельсінкскага камітэта (http://www.belhelcom.org).*

This document was created using
Smart PDF Creator
To remove this message purchase the
product at www.SmartPDFCreator.com